ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## У ЦЭНТРЫ СУСВЕТНЫХ ПАДЗЕЙ

**Мар'яна Шчоткіна правяла сустрэчу з адміністратарам ПРААН**

На мінулым тыдні ў Нью-Ёрку ў штаб-кватэры Праграмы развіцця ААН сустрэліся намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна Шчоткіна і адміністратар ПРААН Ахім Штайнер. Цэнтральнай тэмай сустрэчы сталі сумесныя двухбаковыя праекты.

Як адзначае БЕЛТА, віцэ-спікер верхняй палаты павіншавала Штайнера, які ў красавіку 2017 года быў назначаны на пасаду адміністратара. Акрамя таго, яна падзякавала ПРААН за праграмы, якія Беларусь рэалізуе сумесна ў такіх галінах, як экалогія, эфектыўнае кіраванне, эканоміка і падтрымка груп насельніцтва. Мар'яна Шчоткіна таксама выказала ўдзячнасць за дапамогу ў пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Падчас гутаркі намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыла, што краінавая каманда ПРААН у Беларусі пад кіраўніцтвам рэзідэнта-каардынатара Санакі Самарасінхі адрозніваецца высокім прафесіяналізмам і ініцыятыўнасцю. Асобна Мар'яна Шчоткіна падзякавала ПРААН за ініцыятыву рэалізацыі праекта па тэхнічнай дапамозе ва ўмацаванні патэнцыялу нацыянальнага каардынатара і ўцягванне парламента Беларусі ў працу па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

## «УСХОДНІЯ» ІНВЕСТЫЦЫІ

**Адбылася рабочая сустрэча Сяргея Рахманава і намесніка старшыні групы дружбы Японія — Беларусь парламента Японіі Масака Моры**

З японскага боку на сустрэчы прысутнічалі таксама прадстаўнікі кампаній, якія займаюцца нафтаперапрацоўкай, будаўніцтвам, вырабам медыцынскіх прэпаратаў і іншымі відамі бізнесу.

Удзельнікі абмеркавалі такія тэмы, як двухбаковае японска-беларускае міжпарламенцкае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва. У сустрэчы таксама прынялі ўдзел парламентарыі Ірына Старавойтава, Святлана Герасімовіч, Віктар Сірэнка, члены рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Японіі.

На мінулым тыдні Сяргей Рахманаў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы сустрэўся з прадстаўнікамі карпарацыі па здабычы солі правінцыі Цзянсу Кітайскай Народнай Рэспублікі і СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка Вялікі Камень». Галоўнай тэмай перагавораў таксама сталі інвестыцыі.

## АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — НА РАЁНЫ

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Аляксандр Папкоў наведаў Дрыбінскі раён Магілёўскай вобласці**

У рамках свайго візіту старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні паўдзельнічаў у пасяджэнні Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта. На ім Аляксандр Папкоў звярнуў увагу на тое, што сёння неабходна дакладна каардынаваць працу кіруючых органаў раёна для паўсюднага развіцця рэгіёна.

Акрамя таго, Аляксандр Папкоў правёў асабісты прыём грамадзян, на якім былі прыняты ўсе ахвотныя. Галоўнымі пытаннямі нефармальных зносін сталі новыя працоўныя месцы, вядзенне асабістых падсобных гаспадарак, а таксама арганізацыя спрыяльных умоў для вядзення бізнес-праектаў.

Усе, хто звярнуўся да старшыні Пастаяннай камісіі, атрымалі неабходныя тлумачэнні. Рашэнне праблем, якія запатрабавалі дадатковага вывучэння, Аляксандр Папкоў узяў на кантроль.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЗАДАЦЬ ПЫТАННЕ І АТРЫМАЦЬ АДКАЗ

## Сустрэчы з насельніцтвам назвалі днём адкрытага пісьма

**Раз на год у кожным сельсавеце Лунінецкага раёна праходзяць сустрэчы прадстаўнікоў улады з насельніцтвам, дзе разглядаюцца пытанні жыццядзейнасці на акрэсленай тэрыторыі. На сустрэчу прыязджае старшыня райвыканкама разам з кіраўнікамі асноўных раённых службаў. Сюды запрашаюць прадстаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, якія функцыянуюць на тэрыторыі пэўнага сельсавета. Абмяркоўваюцца самыя розныя праблемы, уздымаюцца пытанні, якія хвалююць жыхароў населеных пунктаў.**



Старшыня сельскага Савета Валерый КРАСНІКЕВІЧ каля помніка ў Сінкевічах.

Мерапрыемства назвалі днём адкрытага пісьма, бо своеасаблівы маніторынг грамадскай думкі праводзіцца загадзя. Людзям даюць магчымасць пакідаць свае пытанні і прапановы ў паштовай скрыні, якая ўстанаўліваецца ў сельскім Савеце. Таму на сходзе некаторыя аўтары пытанняў адразу атрымліваюць адказы. Летась такая сустрэча ў Сінкевіцкім сельскім Савеце праходзіла 18 мая. Па яе выніках складзены пратакол, дзе адлюстраваны даручэнні адпаведным службам на падставе скаргаў і прапаноў грамадзян.

Са старшынёй сельвыканкама Валерыем Краснікевічам праглядаем гэты дакумент. Многія яго пункты пазначаныя як выкананыя. Напрыклад, у адным з лістоў, што былі агучаныя на дні адкрытага пісьма, жыхары вёскі Мокрава пакінулі просьбу адрамантаваць дарогу на вуліцы Янкова, аналагічная заява паступіла з вёскі Вострава, там указалі асабліва праблемны ўчастак ад чыгуначнага моста да вуліцы Машэрава. Рамонт названых участкаў дарог праведзены ў другім квартале мінулага года.

Наогул пытанне стану дарог адно з самых праблемных у Сінкевіцкім сельсавеце. Пра дарогі найбольш гаварылі і на сустрэчы ў маі гэтага года. На тэрыторыі ўсяго 30 працэнтаў асфальтаваных дарог, 40 працэнтаў — гравійныя, астатнія пясчаныя. Сельвыканкам скарыстаў суседства з вядомым у краіне прадпрыемствам «Граніт» і заключыў з ім дагавор на бязвыплатнае выдзяленне шчэбеню і адсеву для падсыпкі дарог. Такім чынам яшчэ летась былі падсыпаныя чатыры вуліцы ў аграгарадку Сінкевічы. Сёлета «Граніт» зноў выдзеліў матэрыялы, якія вырашана накіраваць для паляпшэння дарог у вёсцы Мокрава. На двух вуліцах спецыялісты ДРБУ-101 работу правялі, тры іншыя вуліцы чакаюць сваёй чаргі.

Валерый Краснікевіч расказвае, што на работу па добраўпарадкаванні вуліц нярэдка выходзяць і самі жыхары вёсак. Менавіта з іх дапамогай быў падсыпаны ўчастак дарогі, які злучае вёскі Мокрава і Вострава. Талакой зрабілі ямачны рамонт працягласцю каля кіламетра на вуліцы Янкова ў вёсцы Мокрава.

Здараецца, людзі задаюць пытанні на першы погляд дробныя, ды, аказваецца, актуальныя для іншых. Так, адзін з жыхароў Сінкевічаў пытаўся, ці можна выпісаць у лясніцтве дроў на ўмовах саманарыхтоўкі. На мерапрыемстве прысутнічаў дырэктар лясгаса Вячаслаў Торчык, які растлумачыў парадак такой выпіскі. Некаторыя жыхары ўжо скарысталі зручную для іх форму нарыхтоўкі.

Варта адзначыць, што Сінкевіцкі сельсавет сёлета прырос сямю населенымі пунктамі. У ходзе рэарганізацыі далучыліся вёскі, якія раней адносіліся да Мікашэвіцкага гарсавета. Адтуль таксама прыехалі людзі на майскі сход гэтага года і адразу ўзнялі пытанне пра сенакос для прыватнай жывёлы. Бо ў вёсцы Запроссе, напрыклад, трымаюць яшчэ 17 кароў, там бывалі праблемы з кармамі. Узнятае пытанне вырашылася амаль адразу, бо ў зале прысутнічалі прадстаўнікі сельгаспрадпрыемства.

Самым прыемным момантам сёлетняга дня адкрытага пісьма стала падзяка, якую выказалі вяскоўцы за добраўпарадкаванне. Мелася на ўвазе стаянка на восем парковачных месцаў каля адміністрацыйнага будынка ў Сінкевічах. Ажыццяўленне ўказанага праекта стала магчыма дзякуючы ўдзелу асобных жыхароў, а таксама мясцовым прадпрымальнікам. Апошнія далі грошы на пакупку матэрыялаў, далучылася і сельгаспрадпрыемства, якое аплаціла 10 тон асфальту. Вяскоўцы выйшлі на суботнік і дапамаглі прывесці пляцоўку ў парадак. Цяпер там прыемна паставіць транспарт, побач клумба. Талакой жа даводзілі да ладу і помнік у цэнтры Сінкевічаў, які ўстаноўлены на брацкай магіле. Манумент паднавілі, паклалі 20 квадратных метраў тратуарнай пліткі, устанавілі бардзюр, каля ўвахода паставілі дзве лаўкі. Святочнае мерапрыемства 9 мая сёлета адбылося каля абноўленага помніка. І як бачым, гэта ацанілі людзі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Лунінецкі раён.*

# ІМІДЖ КРАІНЫ І... БІЗНЕС

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).***

Каб спрасціць умовы работы прадпрымальнікаў, паўстала неабходнасць значнага ўдасканалення заканадаўства, лічыць **член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар кампаніі «Марка» Мікалай МАРТЫНАЎ:**

— Каб ісці ў нагу з часам, развіваць эканоміку, даўно трэба зняць залішнюю нагрузку на бізнес. Заканадаўчая і выканаўчая ўлады на месцах павінны стварыць усе ўмовы для вядзення бізнесу. Частка парушэнняў у той жа падатковай сферы адбываецца без злога намеру — проста таму, што, каб у ёй разабрацца, трэба трымаць армію вопытных бухгалтараў. Беларускі бізнес гатовы сумленна плаціць падаткі, а чыноўнікам на месцах трэба смялей ісці насустрач наватарам у бізнесе і не баяцца браць на сябе адказнасць. У сваю чаргу, удасканаленне заканадаўства — адна з самых важных дзяржаўных задач, і нельга, каб ад адной коскі залежаў сэнс закона. Важна, каб мы ўсе чыталі законы аднолькава.

Сенатары вывучалі магчымасці і складанасці на прыкладзе шэрагу гомельскіх прадпрыемстваў. Яны наведалі вытворчую базу прадпрыемства «Гомельаблдарбуд», якое па аб'ёмах асфальтабетону, які тут выпускаецца, займае трэцяе месца ў краіне. Прадпрыемствы «Камконт» і «Алкапак» маюць розны профіль, але ж абодва ўваходзяць у свабодную эканамічную зону «Гомель-Ратон». Кіраўнік яе адміністрацыі Антаніна Яжова гаворыць, што сёння тут працуе капітал 16 краін свету. За гады існавання гэта пляцоўка для развіцця бізнесу і прыцягнення замежных інвестараў сябе апраўдала. Спрыяльныя ўмовы прыносяць плённы вынік, у чым і пераканаліся сенатары. Напрыклад, кампанія «Алкапак» сёння закрывае 95% патрэб Беларусі ў адмысловых корках для алкагольнай прадукцыі.

Інкубатар для развіцця бізнесу ў Гомельскім тэхнапарку, дзе сёння 18 рэзідэнтаў, таксама прыцягнуў увагу членаў Савета Рэспублікі. Яго дырэктар Дзмітрый Марозаў адзначае, што адна з мэт і нават місія — зрабіць так, каб таленавітыя дзеці заставаліся на радзіме, а не шукалі месца пад сонцам у іншых краінах. Спектр дзейнасці кампаній, многія з якіх робяць грошы ў віртуальнай рэальнасці, вельмі шырокі — ад распрацоўкі мабільных праграм да вырабу нанатэхналагічнага даследчага абсталявання. Напрыклад, унікальны партатыўны глюкометр для дыябетыкаў распрацавала кампанія «АйЦіСапортМі». Яе амерыканскі дырэктар па тэхналогіях фірмы Global Healthcare Management Андрыс Васкіс расказвае, што калектыў гомельскага філіяла пачынаўся з двух праграмістаў і за пяць гадоў вырас да сотні чалавек:

— І мы не спыняемся, наш вялікі і дружны калектыў будзе расці. Дарэчы, тут, на Беларусі, вельмі таленавітыя маладыя людзі. Менавіта іх трэба прыцягваць і прасоўваць далей.

Падобныя праекты, адзначаюць сенатары, трэба падтрымліваць, бо яны спрыяюць стварэнню станоўчага іміджу краіны. Дарэчы, такі бізнес-інкубатар, як у СЭЗ «Гомель-Ратон» — не адзіны ў краіне. Аналагічных у нас больш за два дзясяткі. Адным з важных пастулатаў новага дакумента пра развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы, які ў хуткім часе павінны быць прыняты на ўзроўні Прэзідэнта, з'яўляецца ўжыванне прынцыпу самарэгулявання бізнесу. Пры гэтым дзяржаўныя органы павінны мінімальна ўмешвацца ў дзейнасць прадпрымальнікаў. Індыкатар стварэння спрыяльных умоў для развіцця дзелавога асяроддзя ва ўсім свеце — работа малога і сярэдняга бізнесу, нагадвае **дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Беларусі Пётр АРУШАНЬЯНЦ:**

— Работа па падрыхтоўцы пакета дакументаў праводзілася каля паўгода з удзелам максімальнай колькасці прадстаўнікоў бізнесу і дзяржаўных органаў. Сёння яна на завяршальнай стадыі. Патрабаванні да бізнесу плануецца паменшыць у разы. Напрыклад, былі сабраны і прааналізаваны ўсе пажарныя нормы. Высветлілася, што абавязковыя патрабаванні складаюць 586 пунктаў. Цяпер адсеклі ўсё, што можна перадаць на ўзровень самарэгулявання, і засталося ўсяго 58 пунктаў. У 10 разоў скарацілі колькасць пунктаў у санітарных нормах. Па ліцэнзаванні пералік скарочаны на 40%. Калі бізнес адпавядае ўстаноўленым патрабаванням, ён адкрыты і празрысты, прадпрымальнік бярэ на сябе адказнасць і пачынае дзейнасць. Ліцэнзаванне будзе заставацца толькі ў тых галінах дзейнасці, якія датычыцца пытанняў бяспекі, ахова здароўя і жыцця грамадзян.

Да таго ж, расказаў Пётр Арушаньянц, адабрана 23 найбольш распаўсюджаныя віды эканамічнай дзейнасці, у якіх засяроджана 95% суб'ектаў гаспадарання. Большасці з іх пасля прыняцця новых правілаў для прадпрымальнікаў пры адкрыцці сваёй справы не трэба будзе браць нейкія дадатковыя дазволы. Толькі — зрабіць апавяшчэнне ў мясцовыя органы ўлады і з наступнага дня можна пачынаць працаваць. Маркуецца таксама абвясціць мараторый на павышэнне падатковых ставак. А крыху пазней распрацаваць і значныя змяненні ў Падатковы кодэкс Беларусі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*